Генеральная пракуратура
Рэспублікі Беларусь
**Пракуратура
горада Віцебска
Віцебскай вобласці**

вул.Леніна, 8в, 210015, г.Віцебск,
Тэл. 26 28 47, факс 26 28 39
vto-viteg@prokuratura.gov.by
www.prokuratura.gov.by

Генеральная прокуратура
Республики Беларусь
**Прокуратура
города Витебска
Витебской области**

ул. Ленина, 8в, 210015, г. Витебск
Тел. 26 28 47, факс 26 28 39
vto-viteg@prokuratura.gov.by
www.prokuratura.gov.by

17.07.2023 32.26-683-2022/1768

Старшыні Віцебскага
гарвыканкама

Арлову М.В.

вул. Леніна, 32
г. Віцебск

Аб накіраванні скаргі

Пракуратура горада Віцебска, кіруючыся патрабаваннямі п. 10 Пераліку дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, адказных за разгляд зваротаў па сутнасці ў асобных сферах жыццядзейнасці насельніцтва, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15.10.2007 № 498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб», для разгляду накіроўвае электронную калектыўную скаргу па пытаннях неналежнага стану лесвіц, размешчаных у месцах агульнага карыстання ў горадзе Віцебску, правядзення пры неабходнасці іх рамонту, невыканання заявак грамадзян па рамонце лесвіц, прыцягнення вінаватых асоб да адказнасці і па іншых пытаннях.

Аб выніках разгляду скаргі неабходна паведаміць заяўнікаў і пракуратуру горада Віцебска ва ўстаноўлены законам тэрмін.

Адначасова Віцебскаму гарвыканкаму прапануецца прыняць меры па абмежаванні доступу да прагляду звестак аб заяўках, якія накіроўваюцца грамадзянамі праз партал 115.бел, для асоб, якія не з'яўляюцца ініцыятарамі, стваральнікамі такіх заявак (для пабочных асоб).

Дадатак: калектыўная скарга з дадаткам на  л. у першы адрас.

Пракурор горада Віцебска
старэйшы саветнік юстыцыі А.С. Шклярэўскі

Барысенка 262807